вай пліты фігуры ўкленчаных нябожчыкаў паказаны ў гарэльефе "ў поўную акругласць", астатнія элементы кампазіцыі – у барэльефе. Для выяў характэрныя неўпрыгожанасць характарыстыкі, тыповыя для сарматызму наіўнасць і непасрэднасць у перадачы поз, касцюма. Нябожчыкі стаяць на каленях перад крыжамі, адзін супраць другога: Мікалай Вольскі ў рыцарскіх латах, ля яго ног ляжаць шлем з забралам і меч. Твары партрэтныя, перададзеныя без усялякай ідэалізацыі. Маналітнасць фігур падкрэсліваюць шырокія згладжаныя складкі адзення, плаўныя абрысы контураў. Застыласць маналітных поз, лаканізм абагульненых контураў цудоўна выяўляюць задуму кампазіцыі – ушанаваць памяць нябожчыкаў – фундатараў касцёла.

Партрэтная скульптура надмагілляў раней за жывапісныя выявы знайшла сродкі ўвасаблення індывідуальнай асобы, якія склаліся ў колах магнетэрыі Вялікага княства Літоўскага і распаўсюдзіліся на шляхетныя і часткова гарадскія слаі паноў–мяшчан. Спецыфічнасць іх у тым, што ў мемарыяльнай скульптуры ідэі Рэнесансу і формы цесна перапляліся з традыцыйннымі наіўнымі поглядамі, часцей за ўсё – з рысамі гатычнай традыцыі. У арэале Вялікага княства Літоўскага менавіта пры дапамозе надмагілляў высокія традыцыі Рэнесансу маглі быць пераасэнсаваны, маглі ўплываць на свет мастацкіх ўяўленняў грамадства, спажыўцоў, ды і саміх майстроў. У скульптуры адбыўся працэс фальклярызацыі прафесійнага мастацтва, у выніку чаго ўзніклі мастацкія з'явы рэгіянальнай і нацыянальнай афарбоўкі. Мемарыяльная скульптура шукала і дала выйсце велізарнай жыццёвай энергіі. Яна была неабходная рамесным слаям горада, часта адарваным ад высокай гуманістычнай еўрапейскай культуры. Але менавіта гэтыя слаі мастакоў унеслі ў мастацтва Беларусі свет фальклорных формаў, ідэй, наіўных ўяўленняў, фантазій і жыццевай абаяльнасці, – усяго таго, што з'явілася значным у спадчыне мастацтва часоў Вялікага княства Літоўскага.

**Т.В.Кузьмініч**, выкладчык
Беларускага універсітэта культуры

## ГІСТОРЫКА-РЭЛІГІЙНАЯ ТЭМАТЫКА Ў ДАКУМЕНТАЛЬНЫМ ПАТОКУ ПА ГІСТОРЫІ І ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУКАХ БЕЛАРУСІ (1982 – 1997 гг.)

Дакументальны паток (ДП) уяўляе сукупнасць матэрыяльных носьбітаў, на якіх зафіксавана сацыяльна значная інфармацыя, створаная чалавецтвам у працэсе жыццядзейнасці. Дыферэнцыяцыя яго магчымая па шэрагу прымет, у тым ліку і па змесце дакументаў як аб'ектаў уліку. ДП па гісторыі мае сінхранічна-дыяхранічны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характар. Ён уключае дакументы як факты, адзінкі гісторыка-культурнага працэсу, што могуць выступаць у якасці крыніц яго вывучэння. Частка гэтай сукупнасці змяшчае гістарычную па змесце інфармацыю, г.зн. асэнсаванне і пераасэнсаванне гістарычнага мінулага чалавецтва, асобных народаў і нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў, гістарычных эпох, перыядаў, падзей, асобных бакоў гістарычнага працэсу і г.д.

Бібліяметрычны аналіз ДП па гісторыі і гістарычных навуках Беларусі з 1982 па 1997 г. абумоўлены яго інтэнсіўнасцю і структурнымі зменамі сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў краіне. Да канца 80-х гадоў пераважную колькасць ДП складалі дакументы, прысвечаныя паслякастрычніцкаму перыяду гісторыі Беларусі, асабліва падзеям Вялікай Айчыннай вайны, у прыватнасці, партызанскаму і падпольнаму рухам. Працэсы дэмакратызацыі беларускага грамадства, якія пачалі здзяйсняцца з другой паловы 80-х гадоў і ўзмацніліся ў пачатку 90-х гадоў з абвяшчэннем незалежнасці Беларусі, накіраванасць дзяржаўнай палітыкі на нацыянальна-культурнае адраджэнне і захаванне гістарычнай спадчыны станоўча паўплывалі на развіццё нацыянальнай гістарычнай навукі (пашырылася тэматыка даследаванняў, стаў магчымым разгляд падзей з пазіцый альтэрнатыўнасці), гістарычнай адукацыі (гісторыя Беларусі ўведзена ў якасці самастойнага прадмета), актывізацыю дзейнасці грамадскіх арганізацый і суполак, палітычных партый у рэчышчы нацыянальна-культурнага адраджэння. Гэта паспрыяла, з аднаго боку, павелічэнню цікавасці да гістарычных крыніц і дакументаў, з другога – колькасным і якасным зменам у ДП па гісторыі і гістарычных навуках Беларусі. Удзельная вага яго за разглядаемы прамежак часу складала прыкладна 2,5 – 4% адносна ДП, створанага на тэрыторыі Беларусі і звязанага з ёй па змесце.

З 1985 г. назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да павелічэння аб`ёму дакументальнага патоку па гісторыі і гістарычных навуках Беларусі. Вызначылася тэндэнцыя росту ўдзельнай вагі ДП па дакастрычніцкім перыядзе гісторыі нашай краіны, ускладнення тэматычнай структуры за кошт утварэння новых ДП па раней не распрацоўваемых тэмах ці ўзбуйнення ДП, якія былі прадстаўлены адзінкавымі дакументамі (напрыклад, старажытныя беларускія княствы, Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, дзейнасць беларускай шляхты, Беларуская Народная Рэспубліка, беларусізацыя 20 – 30-х гадоў, Слуцкі збройны чын, антыфашысцкі рух на Беларусі, калабарацыя на Беларусі, гісторыя народаў, якія пражываюць на тэрыторыі краіны і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ДП па гісторыі культуры, адукацыі, медыцыны, дзяржавы і права, рэлігіі складаюць нязначную частку ДП па гісторыі і гістарычных навуках Беларусі (да 2%). Павелічэнне колькасных параметраў названых патокаў у 2 – 6 разоў прыпадае на пачатак – сярэдзіну 90-х гадоў. Асабліва выразна гэтая тэндэнцыя праяўляецца ў дакументальным патоку гісторыка-рэлігійнай тэматыкі (гл. табліцу). Дакументы менавіта гэтага тэматычнага накірунку з'явіліся ў ДП па гісторыі і гістарычных навуках Беларусі толькі з канца 80-х гг. У асноўным гэта былі замежныя публікацыі, а таксама артыкулы з айчыннага перыядычнага друку. Аднак трэба мець на ўвазе, што гісторыка-рэлігійныя праблемы маглі быць прадстаўлены ў працах па гісторыі Беларусі наогул, па пэўных гістарычных перыядах, у гісторыка-краязнаўчых дакументах і інш. На жаль, бібліяметрычны аналіз не дае магчымасці выявіць тэматыку дакументаў на ўзроўні факта. Гэта магчыма толькі на аснове адпаведных паўнатэкставых баз даных ці прагляду дакументаў de vizu.

| Тэма | 1989 | 1990 | 1991 | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гісторыя рэлігіі | 2 | - | 27 | 16 | 24 | 36 | 48 | 96 | 110 |
| Усяго | 1180 | 1265 | 1513 | 1591 | 2394 | 2139 | 1922 | 1595 | 1840 |

Аб'ём ДП гісторыка-рэлігійнай тэматыкі ўзрастаў на працягу 90-х гадоў. Гэта характэрна для дакументаў усіх матэрыяльных канструкцый. Найбольшай інтэнсіўнасцю вызначаецца ДП газетных артыкулаў, сярэднегадавы прырост якога вагаецца ад 20 да 40%.

Тэматыка разглядаемага патоку прадстаўлена дакументамі па гісторыі язычніцтва, хрысціянства, праваслаўя, каталіцтва, уніяцтва, ісламу на Беларусі; гісторыі асобных касцёлаў, праваслаўных цэркваў, сінагог, манастыроў (Спаса-Прэабражэнская царква ў Заслаўі, Мінскі кафедральны сабор, Жыровіцкі і Куцеінскі манастыры і інш.); рэлігійнай дзейнасці выдатных асоб айчыннай гісторыі (Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Мялеція Сматрыцкага, Афанасія Брэсцкага і інш.); рэпрэсіях таталітарнага рэжыму супраць царквы наогул і асобных святароў. Аднак гэтыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

патокі прадстаўлены, як правіла, нешматлікімі дакументамі (ад 1 да 20).

Найбольш актыўна распрацоўвалася гісторыя уніяцтва на Беларусі, праваслаўных і каталіцкіх культавых збудаванняў.

Для разглядаемага ДП, як і ДП па гісторыі і гістарычных навуках Беларусі наогул, характэрна ўскладненне тэматычнай структуры ў 90-х гадах, узбуйненне асобных патокаў падчас угодкаў значных падзей рэлігійнага жыцця Беларусі. Напрыклад, 400-годдзе Брэсцкай уніі спрыяла шырокаму абмеркаванню гэтай падзеі ў друку, і ёй быў прысвечаны шэраг адпаведных дакументаў (у 1996 г. – каля 20).

Нягледзячы на значнае павелічэнне агульнага аб'ёму ДП гісторыка-рэлігійнай тэматыкі ў сярэдзіне 90-х гадоў, большасць названых тэматычных накірункаў прадстаўлены невялікай колькасцю дакументаў (у асноўным артыкуламі з часопісаў і газет) і патрабуюць далейшай распрацоўкі (у прыватнасці, гісторыя асобных канфесій на Беларусі, гісторыя культавых збудаванняў, развіццё рэлігійнай думкі ў розныя перыяды). Акрамя таго, у аналізуемым ДП адсутнічаюць абагульняючыя працы па гісторыі рэлігійнай думкі на Беларусі і ў асобных яе рэгіёнах.

**А.Я. Ляскоў**, аспірант
Беларускага дзяржаўнага універсітэта

## СТАНОВІШЧА ХРЫСЦІЯНСКІХ КАНФЕСІЙ У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ( ДРУГАЯ ПАЛОВА XVIII ст.)

Падставай для ўмяшання імперскіх дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай стала пытанне канфесійных узаемадачыненняў у каралеўстве. Вядома, што каталіцкая царква праводзіла нецярпімую палітыку супраць іншаверцаў, большасць якіх складалі праваслаўныя і пратэстанты. У Рэчы Паспалітай былі прыняты дыскрымінацыйныя прававыя акты. Іншаверцы, якіх зняважліва называлі “дысідэнтамі”, адкрыта праследаваліся. Найбольш зацікаўленай у вырашэнні дысідэнцкага пытання была Расія, бо большасць іншаверцаў у Рэчы Паспалітай складалі праваслаўныя беларусы і ўкраінцы. Прусія падтрымлівала правы рэлігійных меншасцей у каралеўстве толькі фармальна і таксама праводзіла пракаталіцкую палітыку. Пацвярджэннем таму можа служыць ліст Фрыдрыха II да прускага пасла Бенуа, у якім ён пісаў: “Па сутнасці я не буду расчараваны, калі дысідэнцкая справа не ўдасца. Вы гэтага не выяўляйце перад рускімі, рабіце выгляд, быццам я вельмі разгневаны, што ўсе намаганні, прыкладзеныя для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ